А.М. Канапелька

# Крылаты Страцім

## Да 110-ай гадавіны з дня нараджэння Максіма Багдановіча



Максім Багдановіч
(1891-1917)

Максім Багдановіч... Той, хто любіць беларускае прыгожае пісьменства, хто звязаў з ім свой лёс, з хваляваннем вымаўляе гэтае дарагое імя. Яно непаўторнае, як непаўторнае Жыццё, Неба, Зямля, як непаўторны Чалавек, надзелены матухнай-прыродай незвычайным талентам, любоўю і вернасцю да ўсяго існага, здольны адкрываць самыя непрыкметныя таямніцы, адценні і колеры спрадвечнай мовы. Ты міжволі ўслухоўваешся ў трапяткую музыку Слова, якая пераходзіць у сімфонію зямнога хараства. Меладычныя гукі плывуць на пругкіх крылах жураўлінага спеву, зялёнага шолаху нярушавых пушчаў і бароў, васількавага зіхоткага трымцення жытнёвых палёў, бруістага ламкнення жывых крыніц. І раптам у сонечныя гукі праменнай сімфоніі ўрываюцца ўраганныя парывістыя вятры, набатны трывожны звон старадаўняй гісторыі, імчацца наўскач за ворагам вершнікі непераможнай Пагоні, і гучаць самотныя песні скрыўджанага, але непакорнага беларусіча...

Сэрца перапаўняецца вялікай радасцю першаадкрыцця, вераю ў Бацькаўшчыну і ў свой Народ, якія запалілі свету і чалавецтву непагасную зорку Максіма. Яна гарыць ярка і мудра, асвятляючы і вядучы за сабою яшчэ з далёкіх паганскіх часоў, калі ў непраходных дрымучых пушчах можна было сустрэцца з Лесуном, Пугачом, Падвеем, Змяіным царом, калі цудадзейнай фантазіяй можна было б не толькі ўявіць, але і сапраўды ўбачыць Зачараванае царства: п'яны ад снежнага мройнага хмелю, гудзіць і кружыцца Падвей; калматы, аброслы дзеразою Лясун то самотна і панура брыдзе па дзікім лесе, то ляжыць стомлены, успамінаючы сваю даўнейшую маладую ўдаласць і сілу; на дне глыбокай сажалкі залёг Вадзянік і пад несціханую песню млына бяздумна марыць і ўрэшце засынае, укрыты цінаю ад глухой непагоды; белы месяц у туманнай панове цягне з возера срэбныя сеткі, у якіх русалкі заблыталі свае косы, – самабытны казачны сплаў прыгожых, вельмі нечаканых маляўнічых фарбаў, народжаных народнай фантазіяй, з уласнымі назіраннямі прыроды, з разнастайнымі асацыяцыямі настрояў, душэўных рухаў, псіхалагічных уяўленняў Майстра.

Згукі Бацькаўшчыны жывуць у паэтавай душы, летуценна пераплятаючыся, як каласы ў вяночку, з лёсам роднай Зямліцы-Маці, якая непакоіцца за свайго адзінага сына, і тады яе «сэрца кроіцца ад болю горкай песні», што нядоўга пажыве ён , што загіне без пары.

Лёс Творцы непадзельны з лёсам роднага народа. Мінуўшчына і дзень сучасны заўсёды зніітаваны ў адзінае цэлае. Нельга разарваць эпохі, раз'яднаць пакаленні, нельга страціць самае дарагое, што дадзена Чалавеку, – Веру, Надзею, Любоў

да радзіных мясцін, да той Зямлі і тых Крыніц, якія кормяць і пояць, да той неўміручай Жывіцы, якая выхавала Цябе ўдзячным сынам. І не дай Бог парушыць гэты адвечны закон – Чалавек перастане існаваць, дзікунства будзе вяршыць свой сатанінскі баль. І тады яго нічым не спыніць ...

Зноў і зноў вяртаецца Максім Багдановіч да Старой Беларусі. Кожнае слова ўслаўляе сумленных і шчырых людзей, чыстых і добрых душою. Ён ганарыцца подзвігамі прашчураў, іх чалавечай годнасцю, самымі будзённымі справамі.

Дух старажытнасці і ваяўнічасці сярэднявечча пульсуе ў нечаканых паэтычных тропах проста, натуральна, даходліва, без усялякіх знешніх упрыгожанняў і рэбусаў.

Тут, у лабірынтах манастырскіх муроў, лунаюць незабыўныя цені славутых продкаў, чуюцца крокі легендарнага Рагвалода і непахіснай Рагнеды, дзяржаўнага Усяслава Чарадзея і мудрай Еўфрасінні, нястрымнага Андрэя Полацкага і адчайнага Вітаўта...

Тут заканчваючы свой век, Летапісец, «душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах», акуратнымі пісьмёнамі славянскай кірыліцы піша праўдзіва Летапіс «пра жыццё ў наш і прошлы час», а самаахвярны Перапісчык «на чыстым аркушу, прад вузенькім вакном», старанна выводзіць літары, зусім не ведаючы, што будзе блаславёны «канец прыгожага труда» што дасведчаны нашчадак з удзячнасцю разгорне некалі «Псалтыр, пакрытую няжорсткай, бурай кожай...». І на яве ўбачыцца, як «Скарына, доктар лекарскіх навук, у доўгай вопратцы на вежы сочыць зоры», а рукі прыгонных дзяўчат, забыўшыся, ткуць «заміж персідскага ўзору цвяток радзімы васілька».

Максім Багдановіч свядома, пераканана праводзіў ідэю лучнасці мінулага, сённяшняга і будучага, сцвярджаючы, што гістарычная памяць народа – аснова нацыянальнага Адраджэння.

Балеснае сэрца паэта не магло прымірыцца з грамадскім злом, з абыякавасцю да лёсу роднага краю, гнеўна адгукалася на бессаромныя спробы рэнегатаў і адшчапенцаў гандляваць беларускім народам, у якога адабралі нават святое права «людзьмі звацца»:

*Народ! Беларускі народ!*
*Ты – цёмны, сляпы, быццам крот.*
*Табою ўсягды пагарджалі.*
*Цябе не пушчалі з ярма*
*І душу тваю абакралі, –*
*У ёй нават мовы няма.*

Максім Багдановіч – духоўны будзіцель нацыі, тонкі знаўца айчыннай і сусветнай культуры, поўнасцю аддаваўся творчасці, бо верыў, што сіла мастака ў высакародным служэнні народу, у здольнасці «будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе». Ён ашчадна і цярпліва, да бурштыннага бляску шліфаваў паэтычнае слова, гартуючы яго ў горане палымянага натхнення, – і паступова згараў сам.

Перачытайце паэзію, прозу, публіцыстыку, літаратурна-крытычныя артыкулы, гістарычныя і этнаграфічныя нарысы, пераклады – і вы зразумееце, які дзівосны талент мела беларуская літаратура. Тое, што зроблена ім за няпоўныя дзесяць гадоў тытанічнай працы, не паддаецца ніякаму вымярэнню – гэта Творца еўрапейскай і сусветнай значнасці, які нараджаецца аднойчы і на стагоддзі.

Ён, закаханы ў Беларусь, спяваў малітоўныя песні Жыццю. Толькі шэрая зязюля («Не кувай ты, шэрая зязюля, сумным гукам у бары!») накувала так мала: 25 гадоў, 5 месяцаў і 16 дзён.

Горды і моцны Страцім, надломлены суровым лёсам, застаўся ў акіяне людской памяці бессмяротнай зоркай Веры, Надзеі, Любові.